5. Чаму ў вызваленых краінах актыўную ролю ў палітыцы адыгрываюць ваенныя і часта ўсталёўваюцца аўтарытарныя рэжымы? Прывядзіце прыклады.
6. Чаму новыя дзяржавы імкнуцца да стварэння міждзяржаўных арганізацый? Прывядзіце прыклады.

Як вы думаеце, чаму ў краінах Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі цяжка прыжываецца дэмакратычная форма кіравання?

# § 40. Кітай у 1945—1978 гг.

*1. Калі была абвешчана Кітайская Савецкая Рэспубліка? 2. Якія палітычныя партыі змагаліся за ўладу ў Кітаі ў міжваенны перыяд? 3. Ахарактарызуйце становішча Кітая ў гады Другой сусветнай вайны.*

У гісторыі Кітая другой паловы XX — пачатку XXI ст. можна вылучыць два асноўныя перыяды. Першы перыяд (1949—1978) ахоплівае сацыялістычныя эксперыменты на мааісцкай аснове. Другі перыяд (з 1978 г.) адкрывае пераход КНР да рыначнай эканомікі — своеасаблівага варыянта перабудовы кітайскага грамадства.

**Утварэнне КНР.** У жніўні 1945 г. завяршылася вызваленне Кітая ад японскай акупацыі. Актыўны ўдзел у вызваленчай барацьбе ўзялі дзве найбуйнейшыя палітычныя сілы краіны — Гаміньдан і Камуністычная партыя Кітая (КПК).

Лідар Гаміньдана Чан Кайшы ўзначальваў урад Кітайскай Рэспублікі. Яго партыя выступала за развіццё эканомікі на аснове рынавых адносін і ўмацаванне сувязяў з заходнімі краінамі.

Камуністы на чале з Маа Цзэдунам першапачаткова кантралявалі невялікую тэрыторыю — так званы Асаблівы раён на поўначы краіны. Гэты раён быў шматгадовай базай Народна-вызваленчай арміі Кітая (НВАК). Да канца вайны НВАК кантралявала 19 «свабодных раёнаў» з плошчай каля 1 млн км$^2$ і насельніцтвам каля 100 млн чалавек. Колькасць КПК перасягнула мільён, партыя ператварылася ў сілу, з якой даводзілася лічыцца гаміньданаўскаму ўраду. Кітайскія камуністы атрымлівалі дапамогу ад Масквы — узбраенне і грошы. Гэта падтрымлівала іх імкненне да сацыялістычнай рэвалюцыі і пабудовы грамадства паводле савецкай мадэлі.

СССР зрабіў вялікі ўнёсак у разгром японцаў на Далёкім Усходзе. Савецкія войскі нанеслі паражэнне Квантунскай арміі і часова акупавалі тэрыторыю Маньчжурыі. У жніўні 1945 г. паміж Савецкім Саюзам і гаміньданаўскім Кітаем быў заключаны Дагавор аб дружбе і саюзе. Гаміньдан і КПК пачалі перагаворы аб стварэнні кааліцыйнага ўрада. Аднак супярэчнасці паміж імі былі настолькі вострыя, што перамовы не завяршыліся поспехам.

У гэты час савецкі ўрад прыняў канчатковае рашэнне ў сваёй палітыцы адносна Кітая арыентавацца толькі на КПК. У красавіку 1946 г. Савецкі Саюз вывеў свае

Правообладатель Издательский центр БГУ

войскі з Маньчжурыі. Гаміньданаўскі ўрад адразу аддаў загад аб наступленні на паўночным напрамку. У Кітаі зноў пачалася грамадзянская вайна.

Першапачаткова перавага была на баку гаміньданаўскіх войскаў. Але ўжо вясной 1947 г. НВАК перайшла ў наступленне і ў студзені 1949 г. заняла Пекін. Затым НВАК захапіла Шанхай і сталіцу гаміньданаўцаў Нанкін, фарсіравала Янцзы і завяршыла разгром Гаміньдана. Чан Кайшы з рэшткамі сваёй арміі перабраўся на востраў Тайвань, абвясціўшы тут *Кітайскую Рэспубліку*.

У канцы верасня 1949 г. у Пекіне было прынята рашэнне аб стварэнні ўрада на чале са старшынёй ЦК КПК Маа Цзэдунам. Галоўнай мэтай камуністаў стала ператварэнне Кітая ў «моцную прамыслова развітую дзяржаву з кіроўнай роляй рабочага класа» і «будаўніцтва ў перспектыве сацыялістычнага грамадства». ***1 кастрычніка 1949 г.*** на шматтысячным мітынгу ў Пекіне новы кіраўнік Кітая абвясціў утварэнне *Кітайскай Народнай Рэспублікі (КНР)*.

**Аднаўленчы перыяд.** Пасля трыццацігадовага перыяду войнаў і рэвалюцый эканоміка КНР знаходзілася ў вартым жалю становішчы. На дапамогу прыйшоў Савецкі Саюз. У *1950 г.* паміж КНР і СССР быў падпісаны Дагавор аб дружбе, саюзе і ўзаемнай дапамозе. Савецкая падтрымка стала найважнейшым фактарам сацыяльна-эканамічнага развіцця КНР.

У краіне пачала праводзіцца аграрная рэформа. Каля 90 % насельніцтва краіны складалі сяляне і толькі 2 % — рабочыя. Значная частка памешчыцкіх зямель нацыяналізавалася, а астатняя перадавалася ў валоданне сельскім жыхарам. Адначасова ствараўся дзяржаўны сектар эканомікі за кошт канфіскацыі ўласнасці буйной нацыянальнай буржуазіі і замежнага капіталу. У 1952 г. быў адноўлены даваенны ўзровень вытворчасці ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

У 1953 г. у КНР пачаліся «сацыялістычныя пераўтварэнні». Пры дапамозе СССР было пабудавана больш за 500 вялікіх прамысловых аб'ектаў. У 1956 г. прамысловасць і гандаль былі практычна поўнасцю нацыяналізаваны, праведзена паўсюднае кааперыраванне сельскай гаспадаркі.

У 1954 г. адбыліся выбары ў новы аднапалатны парламент — *Усекітайскі сход народных прадстаўнікоў (УСНП)*. Старшынёй КНР быў абраны Маа Цзэдун.

**Палітыка «трох чырвоных сцягоў».** У маі ***1958 г.*** КПК прыняла план эканамічнага развіцця краіны, які атрымаў назву «трох чырвоных сцягоў». Пад імі меліся на ўвазе «генеральная лінія», «вялікі скачок» і «народныя камуны».

«*Генеральная лінія*» азначала фарсіраванае будаўніцтва камунізму шляхам *«вялікага скачка»* ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы. У дварах прадпрыемстваў, устаноў, камун пачалі будавацца маленькія прымітыўныя домны для выплаўкі чыгуну і сталі. За пяцігоддзе 1958—1962 гг. планавалася павялічыць вытворчасць сталі ў 20 разоў. Адначасова мільёны людзей працавалі на будаўніцтве каналаў і іншых гіганцкіх збудаванняў. Масавая кампанія па рэалізацыі палітыкі «вялікага скачка» праходзіла пад лозунгам: «Тры гады ўпартай працы — 10 тысяч гадоў шчасця!».

Правообладатель Издательский центр БГУ

У той жа час у вёсцы сотні тысяч кааператываў былі пераўтвораны ў 26 тыс. *«народных камун»*. Мэтай камун было павелічэнне сельскагаспадарчай вытворчасці і «выхаванне новага чалавека».

Аднак курс на «вялікі скачок» у ***1960 г.*** пацярпеў правал. Прамысловая і сельскагаспадарчая вытворчасць скарацілася. Мільёны тон выплаўленай сталі былі нізкай якасці, ды і новых заводаў у дастатковай колькасці не пабудавалі. Акрамя таго, у гэты час пагоршыліся савецка-кітайскія адносіны. СССР скараціў дапамогу Кітаю, а ў 1960 г. і зусім спыніў яе. У асобных раёнах Кітая пачаўся голад.




Кітайскі агітацыйны плакат эпохі Маа Цзэдуна

**«Курс на рэгуляванне эканомікі».** Пасля правалу «вялікага скачка» трэба было зноў аднаўляць краіну і наладжваць нармальнае жыццё. У *1961 г.* пленум ЦК КПК прыняў рашэнне аб выпраўленні памылак і абвясціў *«курс на рэгуляванне эканомікі»*.

У выніку новага курсу сялянам былі вернуты прысядзібныя ўчасткі. Ім дазволілі трымаць дробную жывёлу і птушку, займацца рамёствамі і гандляваць на рынку. Паўсюль уводзіўся прынцып матэрыяльнай зацікаўленасці ў выніках працы.

Дзякуючы прынятым мерам да 1965 г. у краіне ў цэлым была адноўлена вытворчасць і пераадолены голад. Тым не менш унутрыпалітычная сітуацыя заставалася складанай. Усё часцей у адрас Маа Цзэдуна чуліся крытычныя выказванні інтэлігенцыі і часткі партыйнага апарату. У краіне і партыі фарміравалася цалкам рэальная апазіцыя Маа.

**«Культурная рэвалюцыя».** У гэтых умовах Маа Цзэдун і яго прыхільнікі адважыліся на правядзенне чарговай масавай кампаніі. У Кітаі была абвешчана *«Вялікая пралетарская культурная рэвалюцыя»* ***(1966—1976)***. Яна павінна была падавіць крытыкаў і апазіцыянераў, ліквідаваць «здраднікаў», якія перашкаджалі будаваць «узорнае камуністычнае грамадства» ў адпаведнасці з вучэннем Маа. Галоўнай рухальнай сілай «культурнай рэвалюцыі» была кітайская моладзь.

№ 40

*Першы этап* «культурнай рэвалюцыі» *(1966—1969)* характарызаваўся разгулам масавага насілля. Пачалі ствараць атрады *хунвейбінаў* — «чырвоных ахоўнікаў» са школьнай і студэнцкай моладзі і атрады *цзаафаняў* — «бунтароў» з маладых рабочых і служачых.

Карныя органы «культурнай рэвалюцыі» наводзілі жах на ўсіх кітайцаў, незалежна ад іх становішча ў грамадстве. Хунвейбіны і цзаафані грамілі партыйныя камітэты і міністэрствы, захoплівалі прадпрыемствы і навучальныя ўстановы,

Правообладатель Издательский центр БГУ



Група хунвейбінаў, якая здзейсніла самасуд над выкладчыкамі Індустрыяльнага ўніверсітэта г. Харбіна. 1967 г.

праводзілі паказальныя «судовыя працэсы» над усімі западозранымі ў нелаяльнасці да камуністычнай улады. Больш за ўсё пацярпелі прадстаўнікі інтэлігенцыі і ўсе тыя, хто апранаў замежнае адзенне і рабіў модныя прычоскі. Іх білі, зрывалі адзенне, стрыглі дагала. На вуліцах палалі вогнішчы з «буржуазных» кніг і пласцінак. Бібліятэкі і музеі былі разрабаваны. Гарады Кітая ахапілі насілле і хаос.

У ходзе «культурнай рэвалюцыі» многія прадстаўнікі кіроўнай эліты былі адхілены ад улады або рэпрэсаваны. У канцы 1967 г. міністр абароны атрымаў загад узяць пад кантроль арміі сітуацыю ў краіне. У выніку мільёны маладых людзей былі адпраўлены на перавыхаванне ў вёскі. Маа дамогся поўнага панавання ў партыі. Яго ідэі былі прызнаны «пуцяводнай зоркай для ўсяго чалавецтва». Пасля гэтага «культурная рэвалюцыя» перайшла ў новую стадыю свайго развіцця.

*Другі этап* «культурнай рэвалюцыі» *(1969—1976)* характарызаваўся ўмацаваннем рэжыму асабістай улады Маа Цзэдуна, эканамічнай нестабільнасцю і вострай унутрыпалітычнай барацьбой. Кітайскага лідара сталі называць не інакш, як «Чырвонае сонца» і «Вялікі рулявы».

Аднак сітуацыя ў краіне па-ранейшаму заставалася складанай і нестабільнай. Таму кіроўныя вярхі партыі і дзяржавы вымушаны былі аднавіць частку рэпрэсаваных кадраў на даволі высокіх дзяржаўных пасадах. У іх ліку быў будучы рэфарматар Кітая Дэн Сяапін.

9 верасня 1976 г. 82-гадовы Маа Цзэдун памёр, пакінуўшы пасля сябе краіну адсталай і ізаляванай ад усяго свету. На працягу некалькіх гадоў пасля смерці Маа за захаванне сваёй улады вяла барацьбу так званая «банда чатырох». Гэта была група высокапастаўленых членаў КПК, якая вылучылася ў перыяд «культурнай рэвалюцыі». У ходзе гэтай барацьбы перамаглі прыхільнікі Дэн Сяапіна.

**1.** Якія фактары паўплывалі на развіццё эканомікі Кітая пасля Другой сусветнай вайны?

**2.** Ахарактарызуйце палітыку «трох чырвоных сцягоў» у адпаведнасці з планам: а) перыяд правядзення; б) асноўныя мэты; в) метады правядзення; г) вынікі.

**3.** З якой мэтай Маа Цзэдун і яго прыхільнікі арганізавалі правядзенне «культурнай рэвалюцыі»? Назавіце асноўных і найбольш актыўных яе ўдзельнікаў. Якія вынікі і наступствы мела «культурная рэвалюцыя»?

**4.** Дайце ацэнку дзейнасці Маа Цзэдуна і яго метадам пабудовы камунізму.

Правообладатель Издательский центр БГУ

**5.** Ахарактарызуйце эканамічнае становішча Кітая пасля правядзення эксперыментаў у ходзе «вялікага скачка» і «культурнай рэвалюцыі».



**Маа Цзэдун** (1893—1976) — дзяржаўны і палітычны дзеяч Кітая. Адзін з заснавальнікаў КПК, старшыня ЦК КПК з 1943 г. Скончыў педагагічнае вучылішча, працаваў у бібліятэцы Пекінскага ўніверсітэта. Адыграў вялікую ролю ў барацьбе супраць Гаміньдана і ў працэсе ўтварэння КНР. Пасля ўтварэння КНР узначальваў урад краіны. Маа лічыў, што ўзброеная барацьба, тэрор і насілле маюць вырашальнае значэнне ў гісторыі. Такімі метадамі ён імкнуўся як хутчэй пабудаваць сацыялізм і камунізм у Кітаі. Маа лічыў, што класавыя супярэчнасці абвастраюцца ў ходзе будаўніцтва сацыялізму, таму вёў пастаянную ідэалагічную барацьбу супраць сваіх апанентаў. Ён быў таксама прыхільнікам кітайскага нацыяналізму, настойліва падкрэсліваў вядучую ролю кітайскай нацыі ў ходзе рэвалюцыйнага пераўтварэння свету.

# § 41. Кітайская Народная Рэспубліка

*1. Ці быў дасягнуты рэзкі ўздым эканомікі Кітая ў ходзе «вялікага скачка»? 2. Чаму ў працэсе «культурнай рэвалюцыі» зведалі ганенні ў першую чаргу высокапастаўленыя чыноўнікі, вядомыя вучоныя, студэнты?*

Пасля смерці Маа Цзэдуна ў навейшай гісторыі Кітая настала новая эпоха. Пачаўся працэс рэфармавання кітайскага грамадства. У аснову пераўтварэнняў быў пакладзены пераход да рыначнай эканомікі.

**Кітай пасля смерці Маа Цзэдуна.** Маа Цзэдун пакінуў пасля сябе краіну ў стане вострага крызісу. Нават паводле афіцыйных звестак у КНР налічвалася 20 млн поўнасцю беспрацоўных і 8 млн асоб, якія «шукалі» працу, 100 млн чалавек галадала. Асноўныя прадукты харчавання і нехарчовыя тавары размяркоўваліся па картках.

XI з’езд КПК, што адбыўся ў жніўні 1977 г., афіцыйна абвясціў аб завяршэнні «культурнай рэвалюцыі». ***Дэн Сяапін*** быў абраны на пасады намесніка Прэм’ера Дзяржсавета і намесніка старшыні ЦК КПК. Ён быў ініцыятарам і галоўным ідэолагам рэформаў, якія змянілі выгляд Кітая, самым уплывовым палітычным дзеячам, не займаючы першых пасад у партыі і дзяржаве.

**Рэфармаванне сацыялістычнага грамадства.** Яшчэ ў перыяд «культурнай рэвалюцыі» Дэн Сяапін прапанаваў ідэю *«чатырох мадэрнізацый»*, г. зн. вываду на сучасны ўзровень прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і арміі.

Правообладатель Издательский центр БГУ